# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№7 (290)
ліпень 2026

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”

## У НУМАРЫ:

### Таварыства “Уздым” адсвяткавала Купалле і адзначыла сваё 33-годдзе

5 ліпеня каля Дома-музея Райніса ў Беркенэлях сябры культурна-асветніцкага таварыства “Уздым” і запрошаныя госці ў чарговы раз сабраліся разам, каб адзначыць свята Купалля і 33-годдзе таварыства, паведаміў у сваім фэйсбуку Станіслаў Валодзька.

Старонка 7

НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ




# ГІСТАРЫЧНЫ ВІДЭАПРАЕКТ “САРМАТ” ВЯРТАЕЦЦА

Гістарычны серыял “Сармат”, прысвечаны шляхецкай культуры, вяртаецца. Вядоўца – непаўторны Васіль Калач – актор, рэжысёр, фехтавальшчык, заснавальнік рэканструктарскага клуба “Invictus 1863”.

У новых серыях “Сармата” распавядаем пра вядомую і невядомую гісторыю шляхецкіх родаў. У чым сакрэт поспеху і заняпаду магнацкіх родаў? Што па сабе пакінулі Радзівілы? Куды зніклі Алелькавічы? Чым вядомы Сангушкі, Пацы, Тышкевічы? Што галоўнае: грошы або гонар?

Адказы на ўсе пытанні – у новых серыях “Сармата”.

“Наша гісторыя неаднакроць была ад нас схаваная. Як заклятыя скарбы. А наша задача, задача усёй каманды „Будзьма беларусамі“ – адшукаць тыя скарбы і падзяліцца імі, – кажа Васіль Калач. – Для мяне асабіста, даносіць да гледача забытую спадчыну – гонар. Тая традыцыя, тая культура, што збудавала наша сучаснае светаўспрыняцце – у вялікай долі і шляхецкая. Сармацкая, як казалі ў XVII стагоддзі, а не толькі сялянская. Варта памятаць. Нас адвучылі ад ведання свайго радаводу, аднак амаль у кожным беларусе ёсць хоць кропля шляхецкай крыві. Я мару, каб беларусы ўзялі лепшае ад сваіх шляхетных продкаў – гонар, годнасць, шчырае служэнне сваёй зямлі і вольнасць”.

У першай серыі новага сезона раскажам пра Радзівілаў – адзін з самых уплывовых родаў ВКЛ.

Адкуль грошы ў Радзівілаў? Чаму прадстаўнікі роду паміралі маладымі? Хто абылгаў Пане Каханку і як працаваў чорны піяр XVIII стагоддзя? Што ў савецкі час было ў Нясвіжскім палацы? Ці засталіся Радзівілы сёння?

Падпісвайцеся, каб не прапусціць (калі для вас гэта бяспечна).

budzma.org

Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

навіны

# КНІГІ ДВУХ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ УКЛЮЧЫЛІ Ў ДОЎГІ СПІС ПОЛЬСКАЙ ПРЭМІІ ANGELUS

Кароткі спіс прэміі, у якім застануцца толькі сем кніг, абвесцяць у пачатку верасья.

У доўгі спіс літаратурнай прэміі для творцаў з краін Цэнтральнай Еўропы Angelus уключылі кнігу Уладзіміра Арлова "Танцы над горадам. Тры аповесці" ў перакладзе Богдана Задуры на польскую мову і кнігу Святланы Курс (Ева Вежнавец) "Па што ідзеш, воўча?" у перакладзе Малгажаты Бухалік на польскую.

Як адзначаецца на сайце прэміі, у доўгі спіс увайшлі творы 14 пісьменнікаў з Польшчы, Украіны, Босніі і Герцагавіны, Харватыі, Балгарыі, Венгрыі і Чэхіі.

Кароткі спіс прэміі, у якім застанецца толькі сем кніг, абвесцяць у пачатку верасня.

Аўтар кнігі-пераможцы атрымае 150 тысяч злотых (прыблізна 40 тысяч даляраў у эквіваленце. – РС). Па 5 тысяч злотых (амаль 1,5 тысячы даляраў. – РС) таксама атрымаюць усе аўтары, якія трапяць у фінал. Асобна з 2010 году прэмію Angelus прысуджаюць за пераклад на польскую – перакладчык кнігі-пераможцы атрымае 40 тысяч злотых (крыху больш за 10 тысяч даляраў у эквіваленце. – РС).

Літаратурная прэмія Цэнтральнай Еўропы Angelus прысуджаецца за найлепшую кнігу, апублікаваную на польскай мове за папярэдні год. Выдаўцы могуць намінаваць на яе атрыманне жывых аўтараў з 21 краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Прэмію ўвасабляе статуэтка анёла.

Адзіным беларускім аўтарам, які атрымліваў літаратурную прэмію Angelus, пакуль што была Святлана Алексіевіч. У 2011 годзе яе адзначылі за дакумэнтальна-мастацкі раман "У вайны не жаночы твар".

Яшчэ адна беларуская пісьменніца Наталка Бабіна з сваёй кнігай "Рыбін горад" увахodзіла ў кароткі спіс (таксама ў 2011 годзе). А Саша Філіпенка ў 2020 годзе за кнігу "Вяртанне ў Астрог" атрымаў спецыяльны прыз "Выбар чытачоў", які ўручаецца ў выніку анлайн-галасавання.



Літаратурную прэмію Angelus за 2011 год атрымала Святлана Алексіевіч

### Чаму гэта важна

У Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і масавых акцый пратэсту супраць фальсіфікацыі іх вынікаў пачаліся жорсткія рэпрэсіі. Пад палітычна матываваны пераслед трапілі ўдзельнікі пратэстаў, цэлыя прафесійныя групы і грамадскія арганізацыі.

Згодна з даследаваннем ініцыятывы BelPol, агульная колькасць рэпрэсаваных у Беларусі з траўня 2020-га, калі пачалася прэзідэнцкая выбарчая кампанія, па красавік 2026-га складае не менш за 500 тысяч чалавек.

Паводле звестак праваабаронцаў, за кратамі ў Беларусі знаходзяцца сама меней 869 палітычных зняволеных. Кожны месяц такі статус атрымліваюць па 30–50 новых вязняў.

Незалежныя назіральнікі задакументавалі больш за 6000 парушэнняў культурных і чалавечых правоў, якія закранулі дзеячаў культуры – пісьменнікаў, музыкаў, выдаўцоў, акцёраў і мастакоў. Дзясяткі дзеячаў беларускай культуры былі асуджаныя за мінулыя пяць гадоў на турэмнае зняволенне або хатні арышт.

svaboda.org

# НОВАЯ ХВАЛЯ ЦІСКУ НА БЫЛОГА ПАЛІТВЯЗНЯ ПАЎЛА МАЖЭЙКУ

Стала вядома пра пачынанне новай крымінальнай справы супраць былога палітвязня Паўла Мажэйкі. Улады распачалі справу яшчэ 11 траўня 2026 года, праўдападобна, па адным з палітычных артыкулаў – 361-4.

"Я не ведаю, чаго дакладна тычыцца заведзеная справа. Ведаю пра дзясяткі так званых працэсуальных дзеянняў у дачыненні да маіх родных, сваякоў і знаёмых: ператрусы, допыты, у тым ліку нефармальныя размовы", – кажа Павел.

Што цікава, паводле слоў Паўла Мажэйкі, групы сілавікоў падчас ператрусаў шукаюць у Беларусі менавіта яго і "здзіўляюцца", што ніяк не могуць знайсці.

Адначасна з допытамі ў межах заведзенай крымінальнай справы, паводле якой журналісту пагражае да 7 год зняволення, на нефармальных "абавязковых" размовах супрацоўнікі КГБ абавязваюць родных Мажэйкі перадаць яму, што ён можа беспраблемна і бяспечна вярнуцца ў Беларусь.



Паводле Мажэйкі, ён ведае, што падобныя "запрашэнні" даходзяць таксама іншым палітвязням, прымусова вывезеным з Беларусі у другой палове 2025 – пачатку 2026 года.

"Я так разумею, што нас прадалі адзін раз, цяпер прыдумалі спосаб, як "зарабіць" на нас двойчы. Гэтыя структуры зрабілі ўжо столькі зла людзям, і ў мяне няма падставаў лічыць, што яны працуюць дзеля Беларусі і беларускага народа. Выпускайце палітвязняў, прыбірайце палітычныя артыкулы: толькі тады людзі дазволяць сабе пачаць задумвацца пра вяртанне на Радзіму", – каментуе сітуацыю Мажэйка.

Гарадзенскі грамадскі дзеяч і журналіст Павел Мажэйка быў арыштаваны 30 жніўня 2022 года і незаконна засуджаны паводле палітычнага артыкула на 6 гадоў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Карны прысуд аформіў 26 ліпеня 2023 года суддзя Максім Філатаў, вядомы гучнымі палітычнымі выракамі.

11 верасня 2025 года ў ліку іншых беларускіх палітвязняў Павел Мажэйка быў вызвалены з карнай калоніі і прымусова вывезены з Беларусі на тэрыторыю Еўразвязу.

hpravy.org




## ВЫЙШЛА КНІГА "БЫКАЎ. [ПРА] МАСТАЦТВА"

Выйшла кніга даследчыка Сяргея Шапрана, прысвечаная менш вядомаму аспекту таленту Васіля Быкава – выяўленчаму мастацтву, да якога пісьменніка цягнула з маленства, але ў якім ён не здолеў рэалізавацца напоўніцу.

500 старонак і больш за 500 ілюстрацый. Быкаў і мастацтва, Быкаў – пра мастацтва.

Ці захаваліся франтавыя малюнкі пісьменніка і што ён ілюстраваў у другой палове 1940-х і 1950-х гг. у "Гродзенскай праўдзе", дзе ў той час працаваў? Якія занатоўваў лекцыі па выяўленчым мастацтве? Каго са славутых жывапісцаў капіяваў і пра каго пісаў?

Што звязвала Быкава з такімі рознымі майстрамі, як Б. Забораў, А. Кашкурэвіч, Г. Паплаўскі, М. Савіцкі, Л. Шчамялёў і М. Шагал? Як выглядаюць на ягоных шаржах блізкія сябры А. Адамовіч, Р. Барадулін, У. Караткевіч? Як мастакі-графікі жартавалі з Васіля Быкава, і як ён сам кпіў з сябе? Каму прысвяціў апошнія малюнкі? Адказы на многія пытанні чытач знойдзе ў гэтай багата ілюстраванай кнізе.

Шукайце ў "Акадэмкнізе".

budzma.org

навіны

# ЖЫХАРЫ ЛІТВЫ ПАДТРЫМАЛІ ВІЛЕНСКІ БЕЛАРУСКІ МУЗЕЙ ІМЯ ЛУЦКЕВІЧА І “НАШУ НІВУ” ПРАЗ ПАДАТКІ

Беларускія медыя і арганізацыі, якія маюць легальны статус у Літве, скарысталіся магчымасцю атрымаць 1,2 працэнта з падаткаў рэзідэнтаў гэтай краіны.

Праз адлічэнні 1,2% ад падаткаў на фізічных асоб Беларускі музей імя Івана Луцкевіча сёлета сабраў найбольш грошай сярод беларускіх грамадскіх ініцыятываў – 19 312 еўра. На другім месцы сума, якую сабрала выданьне “Наша ніва”, – 19 023 еўра.

У Вільні Беларускі музей імя Івана Луцкевіча вядомы таксама пад назвай Беларускі дом. Установа працуе ў доме пад адрасам вул. Віленская (Vilniaus g.), 20 з 2021 года і за гэты час стала асяродкам прыцягнення як для беларусаў, якія ўжо раней жылі ў сталіцы Літвы, так і тых, хто пераехаў сюды пасля падзей 2020 года.

Дырэктарка музея Людвіка Кардзіс у інтэрв’ю “Радыё Свабода” з задавальненнем адзначыла, што ахвараванняў пабольшала ў параўнанні з мінулым годам.

“Летась мы атрымалі 11 467 еўра, нам гэтак дапамаглі 142 чалавекі”, – прыгадала Людвіка Кардзіс.

“Хачу шчыра сказаць, што гэтая падтрымка для нас як ніколі важная. Сёлета вырасла арэндная плата за наша памяшканне, таму мы вельмі-вельмі ўдзячныя кожнаму, хто ахвяраваў на гэта грошы. Наша арганізацыя сабрала найбольш грошай сярод грамадскіх ініцыятываў, але рэч не толькі ў агульнай суме, але і ў колькасці данатараў. Сёлета нам пералічылі свае грошы 236 чалавек, што таксама найбольш сярод тых, хто атрымаў фінансавую дапамогу праз пералічэнне часткі падаткаў. Гэта нам вялікі стымул, бо сведчыць пра давер да нас і пра разуменне важнасці нашай працы”, – сказала “Радыё Свабода” Людвіка Кардзіс.


Людвіка Кардзіс

Летась Беларускаму музею імя Івана Луцкевіча была падвышаная арэндная плата. Паводле дырэктаркі, цяпер штомесяц музей мусіць плаціць толькі за арэнду 834 еўра.

“Гэта без уліку камунальных платаў. І гэта толькі 50% ад прызначанай арэнды, бо нам далі зніжку на 2 гады. Але агулам з мінулых гадоў арэнда вырасла ў 6,5 раза, знаходзіць грошы складана. Калі казаць пра фінансавае становішча, то выжываем, раскошы няма, мы не можам канкураваць у заробках з літоўскімі музейнікамі, але людзі самааддана працуюць, за што ўсім вялікі дзякуй. А яшчэ ў нас самаахвярна працуюць валанцёры, мы бязь іх не змаглі б праводзіць тыя імпрэзы, якія гэтак палюбіліся беларусам. Таму ўсім вялікі-вялікі дзякуй і за грашовыя пералічэнні, і за валанцёрскую дапамогу”, – сказала Людвіка Кардзіс.

Сярод беларускіх ініцыятываў, на якія ахвяравалі падаткаплатнікі ў Літве, таксама культурны цэнтр “Крок”, віленскі клуб “Спадчына”, Беларуская асацыяцыя бацькоў, Беларуская нацыянальная моладзевая рада, беларуская суполка “Крыніца” з Клайпеды ды іншыя арганізацыі.

Паводле літоўскіх законаў, сумай у 1,2% ад падаходнага падатку падатковы рэзідэнт Літвы можа распараджацца самастойна, накіраваўшы гэтыя грошы на медыя, грамадскія ці палітычныя арганізацыі.

Робіцца гэта пры падачы гадавой падатковай дэкларацыі.

svaboda.org

# АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ І СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ ПАДТРЫМАЛІ СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТУ Ў ПОЛЬШЧЫ

Беларусы зарэгістравалі ў Польшчы ініцыятыву стварэння беларускага ўніверсітэту высокага ўзроўню, сфарвамалі супольнасць з паўсотні экспертаў, цяпер шукаюць падтрымкі ініцыятывы. У спісе прыхільнікаў ідэі з’яўляецца ўсё больш гучных імёнаў.

Нобелеўскі лаўрэат Алесь Бяляцкі далучыўся да падпісантаў адкрытага ліста за стварэнне Беларускага даследчага ўніверсітэту імя Астафея Валовіча, паведамілі ініцыятары стварэння гэтага ўніверсітэту. Далучыцца да ліста можна напісаўшы на электронную пошту admin@valovic.university.

У спісе падпісантаў ліста ўжо былі жонка Бяляцкага Наталля Пінчук, лаўрэатка Нобелеўскай прэміі ў літаратуры Святлана Алексіевіч, прафесарка гісторыі Марсі Шор і прафесар філасофіі Джэйсан Стэнлі, былы амбасадар Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан, галоўны рэдактар Gazeta Wyborcza Адам Міхнік, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў выгнанні Івонка Сурвіла, украінскі гісторык Яраслаў Грыцак, а таксама даследчыкі, выкладчыкі і эксперты з ЗША, Канады, Злучанага Каралеўства, Аўстрыі, Бельгіі, Літвы, Нарвегіі, Нямеччыны, Польшчы, Украіны і Беларусі.

Беларускі даследчы ўніверсітэт імя Астафея Валовіча – зарэгістраваная ў Польшчы асацыяцыя, акадэмічная ініцыятыва стварэння ўніверсітэту, які ў перспектыве мог бы дзейнічаць як вышэйшая навучальная ўстанова ў Польшчы і працаваць на еўрапейскім узроўні ў розных галінах беларусазнаўства і найперш на беларускай мове, а таксама на англійскай. Адукацыйная дзейнасць, паводле задумы, будзе арыентаваная найперш на магістарскія і дактаранцкія праграмы – не толькі на анлайн-навучанне і бакалаўрыят.



“Ініцыятары праекту зыходзяць з таго, што беларускія даследчыкі ў выгнанні – гэта не толькі супольнасць, якая патрабуе падтрымкі. Гэта таксама крыніца ведаў пра Беларусь, экспертнага досведу, міжнародных сувязяў і даследчых кампетэнцыяў, неабходных для разумення сучасных працэсаў і будучай трансфармацыі краіны”, – гаворыцца ў прэс-рэлізе ініцыятывы.

Цяпер праект сфармаваў супольнасць з больш як паўсотні даследчыкаў, мае афіцыйную рэгістрацыю асацыяцыі ў Польшчы, канцэпцыю развіцця, стратэгічны і акадэмічны планы, праводзіць адкрытыя лекцыі і публічныя дыскусіі. Надалей плануе здабываць інстытуцыйную і палітычную падтрымку, навязваць партнёрства з польскімі і міжнароднымі ўніверсітэтамі, а таксама прыцягваць фінансаванне для запуску пілотнай фазы.

***

Астафей Валовіч, у гонар якога названы праект універсітэту, – гэта дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзя, які сярод іншага браў удзел у падрыхтоўцы Статутаў 1566 і 1588 гадоў, актыўна падтрымліваў развіццё адукацыі і кнігадрукавання, фінансаваў друкарню ў Нясвіжы і падтрымліваў дзейнасць мысляроў, такіх як Сымон Будны. Валовіч выступаў з ініцыятывай стварэння вышэйшай навучальнай установы, што ўрэшце прывяло да заснавання Віленскага ўніверсітэту.

belsat.eu

фэст

# Арганізатары TUTAKA: велізарнае захапленне і ўражанне, што людзі падтрымалі фестываль




У польскім мястэчку Гарадок пад Беластокам адбыўся шосты фестываль беларускай культуры TUTAKA. Яго падрыхтоўку арганізатары распачалі летась – адразу пасля сканчэння папярэдняга, і ўжо плануюць наступны фестываль. Журналіст культурна-асветніцкага партала "Будзьма беларусамі!" наведаў фестываль і паразмаўляў з яго арганізатарамі.

### Калі не хочаш плаціць за квіток – можаш прыехаць з актыўнасцю ці валанцёрыць

Галоўным сёлетнім наваўвядзеннем "Тутакі" былі ўваходныя квіткі для наведнікаў. Праз гэта было заўважна, што людзей на фестывалі менш, чым у папярэднія гады.

"Безумоўна, мы заўважылі змяншэнне колькасці людзей. Раней мы ўмоўна і прыблізна налічвалі 5000 чалавек – таму што гэта вельмі складана падлічыць. Сёлета мы зможам гэта зрабіць," – сказала кіраўніца праектаў Фундацыі "Тутака" Настасся Суханосік парталу Budzma.org.

Паводле яе слоў, яны былі да гэтага гатовыя, таму што беларусы прызвычаіліся альбо ні за што не плаціць, альбо плаціць супермаленькія грошы.

"І яшчэ да нас было шмат закідаў пра тое, што мы не зрабілі аднадзённых квіткоў. Але гэта наша прынцыповая пазіцыя. Калі вы набываеце квіток, і калі яго кошт разбіць на чатыры дні, вы заўважыце, што гэта такія маленькія грошы, што нават у краму адзін раз не сходзіш".

"Магчыма, мы недапрацавалі. Можа трэба было больш тлумачыць, дзеля чаго мы ўвялі квіткі. І каб растлумачыць, што немагчыма развіваць фестываль без грамадскага ўдзелу, – кажа Павал Станкевіч, кіраўнік Фундацыі "Тутака",.– Мы тут не арганізуем карпаратыў для Ціханоўскай. Мы рэальна робім прастору для ўсіх. І кожны, хто быў на фэсце, гэта пацвердзіць, мне падаецца".

Паводле слоў Паўла, ён бачыць, што шмат хто пакрыўдзіўся: "Так заўсёды, калі раптам гэтае „на халяву" мяняецца на тое, што „трэба ўкласціся грашыма"".

Ён заўважае, што можна прыехаць на фестываль валанцёрыць ці арганізаваць нейкую актыўнасць. Бо ўсе, "хто рабіў актыўнасці, маюць усё бясплатна і для сябе, і для другой асобы. Валанцёры таксама не плацяць".

### "У кожнага чалавека мусіць быць выбар"

Квіткі – не адзіная прычына змяншэння колькасці людзей. У гэтыя ж дні ў Польшчы адбыўся фестываль "Наш Грунвальд". Частка беларусаў паехала туды. Паралельна ў Варшаве праходзіў канцэрт гурта *System of a Down*, таму некаторыя вырашылі наведаць гэтую імпрэзу.

"Нам таксама пісалі пра гэта, таму што сёлета мы перанеслі фестываль на тыдзень пазней. І ён супадае яшчэ з канцэртам адной знакамітага гурта ў Варшаве. І мы ведаем, што нашая аўдыторыя таксама і там", – сказала Настасся.

Але яна лічыць, што фестываляў мусіць быць шмат.

"Ну праўда. У кожнага чалавека мусіць быць выбар. У Беларусі ў нас яго адабралі, давайце хоць яго зробім тут у Польшчы, гэты выбар. І таму ты можаш абраць сёлета, напрыклад, паехаць да нас, у наступным годзе – на „Грунвальд". І гэта зноўтакі ўсё ж розныя фестывалі".

### Прэзентавалі кнігі, дыскутавалі і спявалі песні з Ціханоўскай

На фестывалі адбылося больш за 80 актыўнасцяў. Акрамя канцэртаў, госці фестывалю маглі наведаць лекцыі, прэзентацыі кніг, майстар-класы, а таксама сустрэцца з выканаўцамі і задаць ім пытанні. Клуб гістарычнай рэканструкцыі "Invictus 1863" арганізаваў паўстанцкі намёт. У ім можна было ўбачыць і патрымаць у руках зброю паўстанцаў альбо даведацца цікавосткі з часоў паўстання 1863–1864 гадоў.

На кірмашы прадавалі адзенне, упрыгожанні, сувеніры з беларускай сімволікай. У тым ліку, там можна было набыць вінілавыя плыткі беларускіх выканаўцаў VOLSKI і J: MORS.

Апроч названых актыўнасцяў, арганізатары зладзілі сустрэчу з лідаркай дэмакратычных сіл Святланай Ціханоўскай. Удзельнікі фестывалю маглі задаць ёй розныя пытанні: ад побытавых і прыватных, кшталту, ці п'е яна піва, да "што рабіць беларусам у сітуацыі, калі ў Польшчы масава адмаўляюць у міжнароднай абароне". Пад канец да сустрэчы далучыліся прадстаўнікі польскага ўраду і спыталі, што яшчэ Польшча можа зрабіць для беларусаў.

Пасля сустрэчы са Святланай Ціханоўскай адбыўся спеўны сход з Сержуком Доўгушавым. Удзельнікі пляцоўкі спявалі беларускія народныя песні. Затым частка наведнікаў перамясцілася на аўкцыён ад *BySol*. Там можна было набыць творы беларускіх мастакоў альбо рэчы, якія перадалі ўдзельнікі фестывалю. Напрыклад, гурт *Dzieciuki* прапанаваў у якасці лота палачкі ад бубнаў свайго ўдарніка з папярэдняга фестывалю, падчас якога той зрабіў прапанову сваёй дзяўчыне.

Сёлета на фестывалі выступалі гурты RIMA, DZIECIUKI, РСП, а таксама выканаўцы Vinsent, Chornabrova, Анастасія Рыдлеўская.

### "Фестываль – гэта жывы арганізм"

Паводле слоў Настассі Суханосік, атрымалася не ўсё. Але на яе думку, гэта цалкам нармальна, бо "фестываль – гэта жывы арганізм". "Ён расце, робіць памылкі і гэтак далей. Мы зрабілі настолькі, наколькі гэта было магчыма, наколькі хапіла нам моцы, высілкаў, валанцёраў, грошай і гэтак далей".

У суботу, 18 ліпеня, удзень пачалася навальніца з залевай. Большасць людзей схавалася пад парасоны на фуд-корце, у намёты і на кірмашы. "Факапы заўсёды ёсць, і гэта норма. Напрыклад, як з надвор'ем – пачалася бура, і таму шмат што перастала працаваць, пазакрываліся некаторыя намёты, але вылезла сонейка, і ўсе назад вярнуліся", – сказала Настасся.

Таксама арганізатары паведамілі, што працавалі з новай аховай, якая яшчэ не ведае ўсіх правілаў. "І дзесяці прабягалі людзі, праязджалі машыны, якія не павінны былі праязджаць. Але гэта ўсё такія рэчы, якія здараюцца пастаянна, на ўсіх мерапрыемствах. І гэта цалкам нармальна".

На яе думку, усяго прадугледзець немагчыма, і на кожнай памылцы яны вучацца, а фэст становіцца ўсё лепшым і лепшым.

Удзельнікі фестывалю падзяліліся, што “магчыма, хацелася б за гэты кошт трошкі больш зручнасцяў для сябе. Напрыклад, больш душавых кабінак. Іх паставілі, але на жаль, мала, – адзначыў наведнік Цімафей. – Хацелася б люстэркаў, бо, напрыклад, месца, дзе пачысціць зубы – гэта не зусім абсталяваня тэрыторыя. То-бок няма ані ракавіны, ані люстэрка. Такіх базавых рэчаў хацелася б. А больш глабальна, вядома, хацелася б, каб гэта ўсё акупілася і фестываль рос, каб усе гэтыя хацелкі ў наступным годзе былі выкананы”.

Арганізатары запэўнілі, што яны чытаюць усе каментары і намагаюцца на ўсё адказваць. “Мы слухаем нашую аўдыторыю. І чаму з’явіліся душы, чаму з’явілася дзіцячая пляцоўка? Таму што гэта запыт нашых наведнікаў, – распавяла Настасся. – Проста пакідайце нам свае фідбэкі, адказвайце на нашыя Google-формы, кажыце, што зайшло, а што не”.

Настасся кажа, што фестываль адбываецца толькі ў шосты раз. Таму арганізатары лічаць яго маладым, і згаджаюцца, што яму ёсць куды расці.

### “Паглядзім, колькі людзей засталося з намі да самага канца”

Пад канец фестывалю арганізатары адчуваюць стому.

“Велізарная стома, але велізарнае захапленне і ўражанне, што людзі ўсё ж такі падтрымалі фестываль, падтрымалі дзейнасць і набылі квіткі, – сказала Настасся Суханосік. – Таму што намётавыя мястэчкі былі запоўнены не цалкам, аднак жа было вельмі-вельмі шмат намётаў, і гэта крута”.

У нядзелю намётаў стае менш і кемпінг пусцее. Людзі з’язджаюць, бо ў панядзелак ім трэба ісці на працу. Але арганізатары маюць ідэю, каб фестываль доўжыўся цэлы тыдзень і каб людзі бралі цэлы адпачынак на працы на гэты час і заставаліся да панядзелка.

“Сёння мы традыцыйна пасля фестывалю пойдзем сустракаць світанак і паглядзім, колькі людзей засталося з намі да самага канца [гутарка запісвалася ў нядзелю, 19 ліпеня – рэд. Budzma. org]. Самыя моцныя, трывалыя, і такія людзі ёсць. І проста маем надзею, што такіх людзей будзе проста больш і больш. Фэст расце, узмацняецца, і наведнікі разам з намі робяць фэст і беларушчыну яшчэ лепшай”.

А.Ш. Budzma.org



Кіраўніца праектаў Фундацыі „Тутака“ Настасся Суханосік



Павал Станкевіч кіраўнік Фундацыі „Тутака“

**навіны**

# БЕЛАРУСКІЯ СПЕВЫ Ў БАТУМІ АБ’ЯДНАЛІ ДЫЯСПАРУ




Беларуская спявачка Таццяна Грыневіч узяла ўдзел у святкаванні Купалля ў грузінскім Батумі разам з беларускай дыяспарай.

Свята адбылося на беразе Чорнага мора і сабрала беларусаў, якія цяпер жывуць у Грузіі, але захоўваюць і перадаюць народныя традыцыі.

Кажа Таццяна Грыневіч: “Сабраліся беларусы Батумі ў беларускім цэнтры “Аксародак”. Былі суседзі, я так разумею, грузіны. Дзівіліся глядзелі, усміхаліся. Тры дні купальскіх было ў нас. У першы дзень мы спявалі купальскія песні, развучвалі і спявалі. У аўторак быў спеўны сход і танцы. І ў трэці дзень – непасрэдна само Купалле”.

У межах святкавання гучалі купальскія песні, адбываліся традыцыйныя абрады, а таксама нефармальныя сустрэчы ўдзельнікаў супольнасці. Арганізатары падкрэсліваюць, што такія імпрэзы дапамагаюць падтрымліваць культурную сувязь з Беларуссю нават удалечыні ад радзімы. Купальскі сезон у беларускім народным календары традыцыйна завяршаецца 7 ліпеня.

racyja.com

# КОНКУРС “Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ” МАЦУЕ БЕЛАРУСКУЮ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ

Конкурс “Я нарадзіўся тут – Tu sie urodzilam/em”, які ўжо шмат гадоў праводзіцца ў Гайнаўцы, сёлета сабраў каля трохсот работ аўтараў ва ўзросце ад 3 да 76 гадоў.

Паводле дырэктара Цэнтра беларускай культуры Анатоля Вапа, які з’яўляецца адным з арганізатараў конкурсу, такая колькасць удзельнікаў сведчыць пра нязменную цікавасць да праекта і яго важнасць для жыхароў рэгіёну: “Першае, што мяне здзівіла – што столькі ўдзельнікаў. Дзеці, моладзь патрабуюць мастацтва, патрабуюць розных мастацкіх дзеянняў. Было каля 300 удзельнікаў. Гэта шок проста!”

Анатоль Вапа адзначыў, што конкурс ужо даўно стаў важным элементам захавання беларускай культурнай спадчыны Падляшша: “Калі ёсць такі конкурс як “Я нарадзіўся тут”, то маладыя людзі падумаюць пра ідэнтычнасць і пачнуць цікавіцца. Гэта зацікаўленне ўласнай культурай. І гэта самае важнае, бо ўжо чалавек ведае, адкуль ён”.

Пасля завяршэння конкурсу работы ўдзельнікаў можна ўбачыць на пасляконкурснай выставе ў Музеі і Асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы, якая будзе працаваць цягам года.

racyja.com



навіны

# ТАЛАКА Ў НЬЮ-ЁРКУ

У суботу 27 чэрвеня 2026 у нашым "Беларускім доме" у Нью-Ёрку на Атлантык Авеню, 401 назіралася нязвыклае ажыўленне. Тут былі мужчыны і жанчыны, кожны завіхаўся на сваім працоўным месцы. Гэты выходны дзень стаўся працоўным для некаторых сяброў БАЗА і прыхаджанаў Сабору Св. Кірылы Тураўскага. Парафіяльная рада Сабору ў гэты дзень арганізавала талаку, каб пафарбаваць сцены ў грамадскай зале, бо наступным крокам будзе абнаўленне падлогі. Так ньюёркскія беларусы рыхтуюцца ў пачатку верасня сустракаць гасцей 36 -й Сустрэчы беларусаў Паўночнай Амэрыкі.



Грамадская зала Сабора – гэта галоўная пляцоўка, дзе праходзяць беларускія імпрэзы, сустрэчы і кантакты між беларускай грамадою горада і ваколіц, а часам сюды наведваюцца госці з іншых беларускіх асяродкаў у ЗША і з розных краін. Усё гэта вымагае неабходнасць утрымліваць залу належным чынам, клапаціцца пра абсталяванне, пра эстэтыку, пра стварэнне спрыяльнай атмасферы і захаванне нацыянальнай адметнасці.

У залі, дзе шмат дзвярэй, вакон, розных прыстасаванняў, паліцаў, вітрын не так ужо лёгка ўсё дасканала пафарбаваць. Найперш, за гэтую справу ўзяліся нашы мужчыны, шмат хто з іх ўжо мае практычны досвед такой працы на сваім эмігранцкім шляху. Прыехалі нават хлопцы з Філадэльфіі, якія адразу актыўна ўзяліся за працу. З Нью-Джэрсі дабраліся Аляксандр і Вольга Акульчыкі. Гэнік Лойка энергічна кіраваў працэсам. Валеры Хвашчынскі і Аляксандр Ярмоліч дапамагалі яму спраўляцца з гэтым абавязкам і самі натхнёна працавалі. Віталь Карпейчык і Васіліса Хілько пільна фарбавалі калоны, трошкі дапамагла ім і Ганна Сурмач. Іван Лойка ўпершыню ў гэты дзень наведаў наш Беларускі цэнтр і адразу ж узяўся за працу, як адмысловы маляр, ён дасканала фарбаваў сцены, а потым і ўваходныя дзверы. Наш новы сябра БАЗА з Нью-Джэрсі Аляксандр Гецальд таксама свой выходны дзень актыўна адпрацаваў разам з іншымі талакоўцамі.

А жанчыны тым часам завіхаліся на кухні, каб маляры не засталіся галоднымі. Смачны абед падрыхтавалі Ксенія Барсукова і Вольга Акульчык.

Напрыканцы пад'ехаў старшыня Парафіяльнай Рады Аляксандр Хомчанка, які ў гэты дзень быў заняты на сваёй асноўнай працы і не мог далучыцца раней.

Спорная праца, сумесны абед стварылі сяброўскую спрыяльную атмасферу і працоўны час не здаваўся доўгім і ўтомным. Талакоўцы пачуваліся ў добрым настроі і, як выглядала, не адчувалі стомы, а толькі задавальненне ад зробленай патрэбнай працы. Гэта наш "Беларускі дом" на чужыне, і мы павінны яго ўтрымліваць у належным парадку, каб наш сабор выглядаў не горшым за будынкі іншых народаў, якія мы бачым побач.

Усім, хто браў удзел у гэтай талацэ і чые імёны тут названыя, заслугоўваюць безумоўнай падзякі за тое, што яны не пашкадавалі свайго часу і сілаў і адгукнуліся на просьбу Парафіяльнай рады Сабора. Гэта сведчыць пра іх адказнасць за падтрыманне беларускага жыцця на чужыне і іх адданасць беларускай справе.

**Ганна Сурмач, belarus-news.us**




# БЕЛАРУСЫ ВАШЫНГТОНА І BAZA DC ПАДТРЫМАЛІ "ДОМ У БАБУЛІ" Ў КІЕВЕ

Як паведамляе ў сваім фэйсбуку праект #ineedhelpby, чэрвень стаў асаблівым месяцам для "Дома ў бабулі" – месца ў Кіеве, дзе могуць атрымаць прытулак і дапамогу з базавых рэчаў беларусы, якія апынуліся ў складанай сітуацыі, а таксама валанцёры, вайскоўцы і ветэраны.

Упершыню шэфства над ініцыятывай узяла беларуская дыяспара – першымі адгукнуліся менавіта беларусы Вашынгтона і BAZA DC. Дзякуючы гэтай падтрымцы у валанцёраў атрымалася зрабіць шмат важных спраў. Перш за ўсё была цалкам аплачана месячная арэнда Дома.

За чэрвень праз "Дом у бабулі" прайшлі 26 чалавек. Сярод іх – 14 валанцёраў, 5 новых і 7 дзейных беларускіх добраахвотнікаў, якія працягваюць абараняць Украіну.

У чэрвені Кіеў зазнаў разбурэнні ад масіраваных ракетных удараў. У гэтыя дні "Дом у бабулі" фактычна ператварыўся ў валанцёрскі штаб. У першы дзень пасля ўдару было раздадзена больш за чатыры тоны пітной вады. На наступны дзень пацярпелых частавалі халадніком і працягвалі забяспечваць вадой. Кожную раніцу ў Доме варацца кілаграмы макароны, дзясяткі літраў баршчу і халадніку. Гэтую дапамогу атрымліваюць не толькі мясцовыя жыхары, якія страцілі жытло, але і ратавальнікі, эвакуацыйныя службы і валанцёры, што кругласутачна разбіраюць завалы і дапамагаюць людзям.

Валанцёры зноў з'ездзілі ў Чарнігаў да беларускіх бабулек, якія жывуць там практычна ўсімі забытымі: без пенсій, без падтрымкі, часта без магчымасці звярнуцца па дапамогу. Прывезлі ім прадукты, але, мабыць, не менш важным было іншае – магчымасць сказаць ім, што пра іх памятаюць. Што беларусы, якія жывуць за тысячы кіламетраў, у Вашынгтоне, ведаюць пра іх лёс і хочуць іх падтрымаць.

Яшчэ адна важная справа, якую ўдалося зрабіць дзякуючы падтрымцы, – гэта набыць кветкі і ўскласці іх да мемарыяла "Анёлы Перамогі".

**Паводле facebook.com/ineedhelpby**



навіны

# ТАВАРЫСТВА "УЗДЫМ" АДСВЯТКАВАЛА КУПАЛЛЕ І АДЗНАЧЫЛА СВАЁ 33-ГОДДЗЕ

5 ліпеня каля Дома-музея Райніса ў Беркенэлях сябры культурна-асветніцкага таварыства "Уздым" і запрошаныя госці ў чарговы раз сабраліся разам, каб адзначыць свята Купалля і 33-годдзе таварыства, паведаміў у сваім фэйсбуку Станіслаў Валодзька.

Напачатку ўсе прысутныя здзейснілі старажытны абрад ачышчэння вадой і прайшлі праз зялёную браму.

За святочным сталом усіх вітала старшыня таварыства "Уздым" Лілія Воранава.

І загучалі беларускія народныя і аўтарскія песні, у тым ліку перакладзеныя на беларускую мову Станіславам Валодзькам і Ліліяй Воранавай. Віншаванні чаргаваліся з чытаннем вершаў, прысвечаных Купаллю.

Песні гучалі ў выкананні вакальных калектываў "Натхненне" таварыства "Уздым" і "Раздолле" з Ліван, дуэта "Сяброўчакі" Рэгіны Родзікавай і Таццяны Багданавай, салістаў Рыгора Старавойтава, Жанны Слядзеўскай і Зінаіды Сіліні.

Тэатральная студыя "Чароўны куфэрак" таварыства "Уздым" паказала жартоўную інсцэніроўку беларускай народнай песні "Касіў Ясь канюшыну" у выкананні Вольгі Паўловіч, Рэгіны Родзікавай, Жанны Слядзеўскай і Рыгора Старавойтава.

Вядоўца свята Людміла Сінякова падрыхтавала цікавы сцэнар. Былі тут і Купаліш з Купалінкай – Віктар Бучэль і Рэгіна Высоцская, і траўніца – Таццяна Аляксеева з гаючымі купальскімі травамі, і баба Яга – Людміла Сінякова, якая спачатку спрабавала сапсаваць свята, але пасля праявіла дабрадушнасць і весяліла сваімі жартамі.

Прадоўжылася народнае гулянне пошукамі папараць-кветкі, карагодамі ля вогнішча з песнямі, шляхецкім танцам "Падэспань" і вясёлымі гульнямі. Усе пакдалалі ўсё негатыўнае, што было ў мінулым годзе, кідаючы ў вогнішча старыя сасновыя шышкі. Жанчыны, падышоўшы да сажалкі з ліліямі, пускалі на ваду вяночкі, сплеценыя з купальскіх траў.

facebook.com/stanislav.volodzka

# БЕЛАРУСЫ ВІЛЬНІ ЎШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ АЛАІЗЫ ПАШКЕВІЧ (ЦЁТКІ)

Віленскія беларусы 19 ліпеня ўсклалі кветкі да памятных месцаў, звязаных з дзейнасцю Алаізы Пашкевіч (Цёткі) у Новай Вільні. Памятная падзея была прымеркаваная да 150-годдзя з дня нараджэння беларускай паэткі, грамадскай і палітычнай дзяячкі.

Кажа старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве Алесь Адамковіч:

– Тут, у Новай Вільні, ёсць некалькі месцаў, звязаных і з яе імем. Таму вырашылі на знак гэтай гадавіны прайсціся гэтымі месцамі, гэтымі вулачкамі, дзе калісьці яна жыла, хадзіла, працавала. Найперш усклалі кветкі на вуліцы Алаізы Пашкевіч, якая названа ў яе гонар. А пасля наведалі Нававіленскую псіхіятрычную лякарню, дзе калісьці жыла і працавала Цётка.

Як кажа першы намеснік кіраўніка беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная грамада" Яўген Вільскі, памяць пра Алаізу Пашкевіч ушаноўваюць не толькі беларусы, але і літоўцы:

– Алаіза Пашкевіч (Цётка) з'яўляецца адной з заснавальніц нашай партыі, таксама яна адна з пачынальніц беларускага адраджэння. Таму мы дакранаемся да сваіх каранёў – гэта вельмі важна. Гэтыя месцы, дзе жыла, дзе працавала Цётка, дзе яна памерла. Яна была жонкай падпісанта літоўскай незалежнасці Сцяпонаса Кайрыса.

Нагадаем, Алаіза Пашкевіч прыехала ў Вільню ў 1904 годзе, там працавала фельчаркай у лякарні Новай Вільні. З'ўляецца адной з заснавальніц



Алесь Адамковіч

Беларускай сацыялістычнай грамады, якая стала цэнтрам беларускага нацыянальнага руху пачатку XX стагоддзя. Мела партыйную мянушку "Цётка".

racyja.com

**навіны**

# БЕЛАРУСКАЯ ЦАРКВА Ў ЛОНДАНЕ ЎВАЙШЛА Ў СПІС 100 НАЙВАЖНЕЙШЫХ БРЫТАНСКІХ БУДЫНКАЎ ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI СТАГОДДЗЯ

Рэйтынг склала аўтарытэтная грамадская арганізацыя Twentieth Century Society, якая ўваходзіць у лік шасці грамадскіх арганізацый, упаўнаважаных кансультаваць брытанскую дзяржаву ў пытаннях архітэктурнай спадчыны. Сярод такіх структураў Twentieth Century Society адказвае за будынкі, пабудаваныя пасля 1914 года.

Спіс 100 выбітных будынкаў XXI стагоддзя апублікаваны асобнай кнігай.

Беларуская царква апынулася ў адным шэрагу з такімі знакавымі збудаваннямі, як музей Tate Modern, 30 St Mary Axe (хмарачос-"агурок" у лонданскім Сіці), стадыён Wembley і будынкі парламентаў Шатландыі і Уэльса.

Царква Святога Кірылы Тураўскага і ўсіх святых заступнікаў беларускага народу была пабудаваная ў 2016–2017 гг. на замову Ватыкана для беларускай дыяспары ў Вялікай Брытаніі з нагоды 30-х угодкаў Чарнобыльскай катастрофы.

Беларуская царква размешчаная ў паўночным Лондане побач з іншымі знакавымі для Беларусі будынкамі – хрысціянскім грамадскім цэнтрам Marian House і Бібліятэкай імя Францішка Скарыны. Яна стала першай драўлянай царквой, пабудаванай у Лондане пасля Вялікага пажару 1666 года і першай беларускай царквой у замежжы, пабудаванай адмыслова для беларускіх вернікаў. У 2023 годзе царкву наведала Святлана Ціханоўская, абраная прэзідэнтка Беларусі.

Унікальны праект царквы стаў вынікам маштабных палявых даследаванняў, праведзеных у Беларусі. Аўтар праекту, брытанскі архітэктар Цзывай Со, імкнуўся перадаць дух беларускай архітэктурнай спадчыны, моцна пацярпелай у XX стагоддзі.

Святыня арганічна злучае розныя эпохі. Яна захоўвае традыцыйныя рысы – двухсхільны дах, драўляную ашалёўку фасадаў і цыбулепадобны купал, – адначасова прапаноўваючы сучасныя архітэктурныя рашэнні.

Адметнай асаблівасцю сталі лёгка хвалістыя вертыкальныя драўляныя сцены. Уначы схаваныя верхнія вокны прапускаюць вонкі мяккае святло, ствараючы далікатнае ззянне ў памяць пра людзей, якія загінулі ў драўляных цэрквах, спаленых нацыстамі ў гады Другой сусветнай вайны.



**Спіс 100 выбітных будынкаў XXI стагоддзя апублікаваны асобнай кнігай**

Уключэнне гэтай адметнай царквы, непасрэдна натхнёнай беларускай архітэктурнай традыцыяй, яшчэ больш замацоўвае яе статус як сімвала беларускай культуры, прызнанага на міжнародным узроўні, і падкрэслівае яе ўнёсак у архітэктурную спадчыну Вялікай Брытаніі.

**skaryna.org**

**in memoriam**

## ПАМЕРЛА СВЯТЛАНА КУРС

Апошнія месяцы 54-гадовая пісьменніца змагалася з анкалагічным захворваннем.

Святлана Курс доўгі час працавала ў "Нашай Ніве" і "Еўрарадыё", публікавалася ў "Нашай Ніве", "Свабодзе", "ARCHE", "Нашай гісторыі", "Дзеяслове", "Партызане", на радыё "Свабода" і "Еўрарадыё", супрацоўнічала з тэлеканалам "Белсат".

Аўтарка зборніка прозы "Шлях дробнай сволачы" (2008) і аповесці "Па што ідзеш, воўча?" (2022).

Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" смуткуе і выказвае шчырыя спачуванні ўсім родным і блізкім спадарыні Святланы Курс. Яе адыход у лепшы свет – гэта вялікая страта для беларускай культуры.

**ЗБС "Бацькаўшчына"**



### Беларускі каляндар памятных дат на жнівень 2026 года

**1 жніўня**
- 165 гадоў таму, у 1861-м, памёр Ігнат Ходзька, пісьменнік.
- 105 гадоў таму, у 1921-м, нарадзіўся Уладзімір Урбановіч, краязнавец, культуролаг. Памёр у 1999-м.

**2 жніўня**
- 140 гадоў таму, у 1886-м, нарадзіўся Мікалай Гуткоўскі, юрыст. Расстраляны ў 1938-м.

**3 жніўня**
- 55 гадоў таму, у 1971-м, памёр Янка Маўр (сапр. Іван Фёдараў), адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры.

**4 жніўня**
- 350 гадоў таму, у 1676-м, нарадзіўся Дамінік Рудніцкі, пісьменнік. Памёр у 1739-м.
- 25 гадоў таму, у 2001-м, памёр Вячаслаў Адамчык, пісьменнік.

**8 жніўня**
- 50 гадоў таму, у 1976-м, памёр Мікалай Лапіцкі, праваслаўны святар, рэлігійна-грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**9 жніўня**
- 170 гадоў таму, у 1856-м, памёр Фларыян Бохвіц, філосаф.
- 50 гадоў таму, у 1976-м, памёр Іван Мележ, пісьменнік.

**13 жніўня**
- 70 гадоў таму, у 1956-м, памёр Якуб Колас, народны паэт Беларусі.

**18 жніўня**
- 135 гадоў таму, у 1891-м, нарадзіўся Макар Краўцоў (сапр. Касцевіч Макар), пісьменнік. Загінуў у 1939-м.

**19 жніўня**
- 195 гадоў таму, у 1831-м, нарадзіўся Зыгмунт Чаховіч, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Памёр у 1907-м.

**20 жніўня**
- 45 гадоў таму, у 1981-м, памёр Мікола Хведаровіч, паэт, празаік.
- 35 гадоў таму, у 1991-м, памёр Баляслаў Грабінскі, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**22 жніўня**
- 165 гадоў таму, у 1861-м, нарадзіўся Ігнат Буйніцкі, пачынальнік беларускага нацыянальнага тэатра. Памёр у 1917-м.

**25 жніўня**
- Дзень незалежнасці
- 35 гадоў таму, у 1991-м, памёр Вацлаў Пануцэвіч (да эміграцыі Папуцэвіч), гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**26 жніўня**
- 25 гадоў таму, у 2001-м, памёр Валерый Маслюк, тэатральны рэжысер.

**27 жніўня**
- 120 гадоў таму, у 1906-м, нарадзіўся Сяргей Новік-Пяюн, паэт і празаік. Памёр у 1994-м.

**29 жніўня**
- 270 гадоў таму, у 1756-м, нарадзіўся Ян Снядэцкі, астраном, матэматык, філосаф. Памёр у 1830-м.

**31 жніўня**
- 30 гадоў таму, у 1996-м, памёр Пятрусь Макаль, літаратар.

**Беларусы ў свеце**
№ 7 (290), ліпень 2026
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў
свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар –
Н. Шыдлоўская,
А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com